№ 27-28 (79-80)
Декабрь 2009 г.

Глуская ПАНОРАМА

КАЛЕНДАРЬ

ДЕКАБРЬ

1



20 декабря 1522 г. владелец Глуского замка князь Юрий Иванович Дубровицкий получил от великого князя Великого Княжества Литовского и короля польского Жикгимонта I разрешение основать рядом с замком поселение и организовать там торговлю, удостоверенное специальной грамотой. Первое упоминание в документах Глуска Дубровицкого, на месте которого находится современный Глуск.



Александр- Гиллларий Полубинский

20 декабря 1646 года владелец Глуска Дубровицкого Александр- Гилларий Полубинский получил от короля польского Владислава IV разрешение на устройство перед русскими запустами (Масленица), за 2 недели до Копыльской ярмарки, ежегодной ярмарки продолжительностью в одну неделю.

25 декабря 1895 года в деревне Байлюки родился Ефим Кипель, белорусский общественный деятель, педагог, публицист, активист белорусской диаспоры в США. Участник съезда в Смоленске, провозгласившего Белорусскую Советскую Социалистическую Республику. Подвергся политическим репрессиям 1930-х годов. Председатель 2-го Всебелорусского конгресса. Умер в 1969 г. в США.

11 декабря 2002 года в Минске умер Сергей Граховский, белорусский поэт, прозаик и переводчик, чье детство и юность прошли в Глуске. Подвергся политическим репрессиям 1930-х годов. Умер в 2002 г. в Минске.

ДАРАВАЛЬНАЯ ГРАМАТА КАРАЛЯ УЛАДЗІСЛАВА IV ШЛЯХЦІЧУ ПАЛУБІНСКАМУ З ДАЗВОЛАМ НА ПРАВЯДЗЕННЕ ШТОГАДОВАГА КІРМАШУ У ЯГО МЯСТЭЧКУ ГЛУСК

20 снежня 1646 г.

Мы, Владислав IV...(Т), объявляем этой нашей грамотой, кому об этом знать надлежит, что т.к. доблестные рыцари, досточтимые сановники и все жители нашего государства не представляют себе большего счастья, чем свобода, за которую они готовы не только отдать свое имущество, но и рисковать жизнью, то мы нисколько не противимся их стремлениям, но, наоборот, относимся к ним со всей нашей благосклонностью и любовью и никому из этих мужественных людей не отказываем в своей королевской милости. Так, благосклонно снизойдя к внесенному нам прошению сына пернавского воеводы, благородного Александра Полубинского, принимая во внимание его благородное происхождение и заслуги его предков перед Речью Посполитой, мы этой грамотой разрешаем ему устраивать ярмарку в его местечке, именуемом Глусском Дубровицким, расположенном в Новогрудском пов., один раз в год, перед русскими запустами, за 2 недели до Копыльской ярмарки. Ярмарка должна длиться всю неделю, т.к. обычно купцы, направляющиеся из различных украинских городов на ярмарку в Копыль, съезжаются и останавливаются в указанном выше местечке.

Гарантируем нашим именем и именем наших королевских наследников, что, начиная с числа, указанного в этой грамоте, ярмарки будут проводиться в мест. Глусское неизменно, и другие окрестные местечки не будут чинить этой ярмарке препятствий.

Разрешаем по примеру других наших городов и местечек, находящихся в Вел. кн. Лит., людям любого сословия приезжать ежегодно на упомянутую ярмарку со всеми товарами в таком количестве, какое у них имеется, продавать эти товары, а также покупать, торговать или обменивать. Однако в указанном местечке не должно быть таких людей, которым общее право запрещает предоставлять убежище.

Подтверждая все это, для большей достоверности собственноручно подписав эту грамоту, мы приказали приложить к ней печать Вел. кн. Лит.

Дано в Варшаве дня 20 декабря месяца года господня 1646, царствования нашего польского года 14, а шведского 15.

Владислав, король.

Франциск Гаховский, референдарный и п[исарь] Вел. кн. Лит.

Пераклад з польскай мовы.

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1959. Т. 1. С. 186—187.

Приводится по тексту: «Памяць. Глускі раён». Мінск, БЕЛТА, 1999, с. 63.

АРЫШТЫ. СПРОБЫ ФАБРЫКАЦЫІ ПРАЦЭСУ



Яўхім Кіпель – прэзідэнт Другога Беларускага кангрэсу, пісьменнік, публіцыст. Мікола Рыжы. 1993.

Масавыя арышты пачаліся ў 1930 годзе. У першай палове году арыштоўвалі па два, па тры чалавекі ў месяц, а ў ліпені арыштавалі некалькі сот чалавек. Арыштавалі ня толькі навуковых супрацоўнікаў Акадэміі Навук ды ўнівэрсытэту, але і многа настаўнікаў з раённых гарадоў. У першую хвалю арыштаў трапіла амаль уся беларуская эліта: акадэмікі Я. Лёсік, С. Некрашэвіч, Б. Эпімах-Шыпіла, прафэсары М. Азбукін, І. Васілевіч, Г. Гарэцкі, Я. Дыла, П. Жаўрыд, І. Серада, А. Смоліч, Я. Сушынскі, М. Пракулевіч, А. Цьвікевіч, доктар І. Цьвікевіч, інжынэр Ч. Родзевіч ды шмат іншых. Разам зь імі арыштавалі некалькі сот маладзейшых беларусаў.

Кожнаму арыштаванаму выставілі абвінавачаньне, што ён зьяўляецца сябрам контррэвалюцыйнай арганізацыі «Саюз Адраджэньня Беларусі» (САБ), якая ставіла сабе за мэту стварыць незалежную Беларускую Рэспубліку. Зразумела, што кожны арыштаваны са скуры вылузваўся і даводзіў, што ён ні ў які САБ не ўваходзіў. Кожны патрабаваў ад сьледчых, каб тыя далі довады яго ўдзелу ў тайнай арганізацыі. Так цягнулася месяцы два, а потым вэрсію аб САБ адкінулі і прыдумалі новую, што нібы існавала тайная контррэвалюцыйная арганізацыя «Саюз Вызваленьня Беларусі» (СВБ), якая імкнулася адарваць Беларусь ад Савецкага Саюзу і далучыць яе да Польшчы. А каб зьдзейсьніць гэта, СВБ быццам-бы наладзіў кантакт з польскім генэральным штабам і адтуль атрымваў інструкцыі і грашовую дапамогу. Справу пачалі нанова: кожнага ізноў выклікалі і прад'яўлялі абвінавачаньне ў прыналежнасьці да СВБ. Такое абвінавачаньне было значна цяжэйшае за першае. Гэта — здрада на карысьць буржуазнае дзяржавы. За ўтварэньне такое арганізацыі па савецкіх законах належыць толькі расстрэл.

За год да арышту беларускіх нацдэмаў на Ўкраіне адбыўся судовы працэс над арганізацыяй «Саюз Вызваленьня Ўкраіны», якой ніколі не існавала. Беларускую і ўкраінскую справы хацелі ўвязаць у адно.

Становішча пагаршалася яшчэ тым, што знайшліся сьведкі, якія пацьвярджалі абвінавачаньне. Адным з такіх сьведкаў быў У. Дзяржынскі, знаны літаратурны крытык, аўтар літаратурнай хрэстаматыі, швагер З. Бядулі. Што яго прымусіла стаць на такі шлях, застаецца таямніцай. Праўдзівасьць вымагае адзначыць, што сьведка ён быў малакаштоўны: калі яго прыводзілі на вочную стаўку, ён, нізка спусьціўшы галаву і ня гледзячы на абвінавачанага, заўсёды гаварыў: «Здаецца, гэта было». Спрэчак гэты змушаны сьведка не распачынаў, пасьля трох трафарэтных словаў ён адварочваўся, і канвой адводзіў яго назад у камэру.

Другі сьведка — М. Красінскі, пра якога варта сказаць колькі словаў. У свой час ён, здаецца, выкладаў літаратуру ў беларускай гімназіі ў Вільні. Быў нахабны. Належаў да партыі. Было яму тады гадоў сорак пяць. Нежанаты. Пасьля сьмерці мітрапаліта Мельхіседэка камуністы аблюбавалі Красінскага на беларускага мітрапаліта і для гэтае мэты яго правялі цераз мяжу з Заходняй Беларусі ў Менск. Вернікі і сьвятары зразумелі, што калі яго камуністы хочуць паставіць на мітрапаліта, дык ён будзе мітрапаліт камуністычны, а не хрысьціянскі, і па гэтай прычыне ня сталі знаёміцца зь ім, а нават і гаварыць зь ім не захацелі.

Пасьля няўдачы зь мітрапаліцтвам камуністы ўладкавалі яго на адміністрацыйную пасаду ў Дзяржаўны Тэатар. Там ён працаваў можа з год. У пачатку 1930 году яго арыштавалі, і ён пачаў сябе выдаваць за агента варшаўскага ўраду. Калі трэба было пацьвердзіць абвінавачаньне, прыводзілі Красінскага, і ён спакойна гаварыў: «Так, вы належалі да нашае арганізацыі СВБ». Абвінавачаны хваляваўся, крычаў, сьцьвярджаў, што гэтага чалавека ён ніколі ня бачыў. На гэта Красінскі спакойна адказваў: «Нашая арганізацыя сакрэтная, вам не належала мяне ведаць, аднак вы былі ў нашым сьпісе».

Многа шкоды зрабіў Красінскі, багата папсаваў здароўя і нэрваў маладым арыштаваным беларусам. За гэта яго кармілі з чэкісцкага стала, трымалі ў асобнай камэры, і спаў ён не на голых нарах, як усе арыштанты, а на мяккай пасьцелі. Калі яго выпускалі ў прыбіральню, усе камэры зачынялі, а ў абодвух канцох калідора станавіліся ўзброеныя чырвонаармейцы, бо баяліся, што арыштаваныя выламаюць дзьверы і нападуць на гэтага правакатара. Былі ў турмах выпадкі, калі зьняволеныя нападалі на правакатараў і забівалі іх. Турма вырабляе людзей зацятых і адчайных. Увесь час Красінскага трымалі аднаго, з намі не злучалі, яго аднаго адвезьлі на месяца высылкі ў Шадрынск каля Ўралу, тэрмін ссылкі яму зьменшылі напалову.

Апрача гэтых двох, былі і яшчэ правакатары, але яны былі значна драбнейшыя і асаблівай ролі ў справе нацдэмаў не адыгралі. Чэкісты яшчэ падсаджвалі ў камэры сваіх сэксотаў — укрытых чэкістаў; у некаторых выпадках ім удавалася маскавацца. З паасобных урыўкаў яны будавалі цэлае абвінавачаньне.

Усёж-такі правакатарскіх сьведчаньняў Красінскага было недастаткова, каб стварыць публічны працэс, бо Красінскі ніякай ролі ў нацыянальным руху не адыгрываў. Ніхто ніколі не паверыў-бы, што польскі генэральны штаб мог зьвязаць свае сакрэтныя пляны з такою дробнаю асобаю, як Красінскі. Для публічнага працэсу патрэбна было, каб які-небудзь шырока знаны беларус адкрыта прызнаўся, што ён быў у сувязі з палякамі. Гэта дало-б патрэбны эфэкт.

На такую ролю лепш за ўсё надаваўся былы прэм'ер Рады БНР Аляксандар Цьвікевіч, але ён катэгарычна адмовіўся стаць на такі шлях. Ён цьвердзіў, што пры пераезьдзе

яму далі слова не ўспамінаць мінулага і радзіў чэкістам расстраляць яго без усякага працэсу. Адмовіліся ад прапановы стаць парвакатарам усе, хто вярнуўся з-за мяжы, у тым ліку і акадэмік Смоліч.

Аркадзя Смоліча я ведаў па працы ў Інбелкульце, дзе ён кіраваў аддзелам прыроды і народнае гаспадаркі. Паходзіў ён зь сям'і вясковага сьвятара. Будучы яшчэ студэнтам, шмат падарожнічаў па Беларусі, вывучаў яе прыроду і геамарфалёгію. Пасьля сканчэньня агранамічнага інстытуту А. Смоліч некалькі гадоў працаваў аграномам і за гэты час сабраў многа матар'ялу аб беларускай вясковай гаспадарцы, аб прыродзе ды азнаёміўся з геаграфічнай літаратурай аб Беларусі.

Ягоны падручнік «Геаграфія Беларусі» — першае на Беларусі выданьне такога профілю — хутка заўважылі ня толькі ў Расеі (дзе на яго пачалі злосна нападаць — «за сэпаратысцкі ўхіл»), але і ў Эўропе — у Нямеччыне і Францыі.

Пасьля гэтага зьявілася некалькі працаў Смоліча аб пабудове прамысловасьці на Беларусі, у якіх ён крытыкаваў расейскія мэтады эканамічнага будаўніцтва: калі расейцы дазвалялі будаваць на Беларусі завод для вырабу трубаў, дык краны для гэтых трубаў выраблялiся недзе на Каўказе; калі на Беларусі выраблялiся жалезныя вёдры, дык дны для гэтых вёдраў рабілі дзе-небудзь на Ўрале, таму беларускія вырабы каштавалі даражэй.

Аркадзь Смоліч браў вельмі актыўны ўдзел у Першым Усебеларускім Кангрэсе. Менавіта яму належыць прапанова вывесьці з прэзыдыюму Кангрэсу памешчыка Рамана Скірмунта. Як сябра Рады БНР ён паехаў з Радаю на эміграцыю. Калі Смоліч быў у эміграцыі, амэрыканцы прапанавалі яму выехаць у ЗША, аднак Смоліч паверыў камуністам і паехаў у Савецкую Беларусь. Нейкі час ён працаваў прафэсарам у БДУ, браў актыўны ўдзел у арганізацыі Беларускай Акадэміі, а затым займаў у БАН адказную пасаду. Пакуль і па яго не прыйшлі...

Мінула шэсьць месяцаў ад пачатку майго арышту. Нас кармілі так, каб не памерлі з голаду, есьці хацелася заўсёды. Нам не дазвалялі праходак, не вадзілі ў лазьню, не зьмянялі бялізны, ня стрыглі, не дазвалялі атрымваць перадачы і не давалі газэтаў. У нас паадрасталі бароды, а на галовах — доўгія валасы. Некаторыя з нас прыраклі насіць бароды ўвесь час, каб прыпамінаць, праз што нам давялося прайсьці. Бялізна зусім парвалася, і шмат хто пачаў хадзіць голым. З-за адсутнасьці ў харчох гародніны цынга пачала разьядаць дзясны, яны крывавілі. Аднак чэкісты на гэта не зварочвалі ўвагі, яны ў адзін голас казалі, што трэба пакаяцца і асудзіць свае памылкі.

За месяцы нашага зьняволеньня мы асілілі турэмную азбуку, добра навучыліся перастуквацца. Такім спосабам мы здабывалі зьвесткі аб тым, што творыцца навакол нас. Мы навучыліся хаваць прылады, якімі рабілі надпісы на сьценах. Між іншага, для надпісаў лепш за ўсё падыходзілі цьвікі, бо цьвіком можна было зрабіць глыбокі надпіс, які анучкаю сьцерці нельга, — такі надпіс наступныя арыштаваныя маглі чытаць гадамі. У камэрах чэкісты часта рабіліператрусы, звычайна ноччу, але нічога не знаходзілі.

Нас вартавалі і абслугоўвалі чырвонаармейцы з Саратаўскай вобласьці. Яны былі горшыя за чэкістаў, горшыя за фашыстаў, гэта былі сапраўдныя зьвяры. Пры раздачы абеду і вячэры саратаўскія вылюдкі бралі на дапамогу сабе арыштаваных за кантрабанду, за пераход мяжы ці за спэкуляцыю. Бальшыня з гэтых кантрабандыстаў была лагодна настроеная да нас, і празь іх нам перадавалі і мы перадавалі запіскі ў далёкія камэры. Пры такой сыстэме сувязі мы былі больш-менш у курсе падзеяў.

Нас у камэры сядзела трое: прафэсар агракультуры І. Кісьлякоў, прафэсар геаграфіі М. Азбукін і я. Аднойчы раніцою Азбукіна паклікалі на допыт. Вярнулі яго назад у камэру ўжо пад вечар. На допыце яму прапанавалі стаць на працэс і прасілі, каб і на нас паўплываў. Пры гэтым зь яго ўзялі слова, што аб гэтай просьбе ён нам ня скажа, а будзе дзейнічаць нібы сам ад сябе. Аднак папярэдзілі, што калі ён парушыць дадзенае слова і раскажа, тады хай не чакае добрага.

Праз тыдзень мяне выклікаў на допыт сьледчы Сікорскі. Ён адразу прапанаваў стаць на працэс, я катэгарычна адмовіўся. Выглядала, што мой адказ не зрабіў на яго ніякага ўражаньня. Пахадзіўшы, ён адчыніў дзьверы ў другі пакой і прапанаваў зайсьці туды на пару хвілін. Я зайшоў, дзьверы адразу-ж замкнуліся, і я застаўся адзін. Гэта аказаўся не пакой, а балькон, з бакоў абцягнуты драцяною сеткаю, а зьверху перакрыты жалезнымі кратамі — вылезьці з балькону было немагчыма. Я сядзеў там гадзіны тры, вельмі зьмёрз. Я і крычаў і стукаў — нішто не памагала. Нарэшце дзьверы адчыніліся, перада мною стаяў начальнік сакрэтнага аддзелу Аргаў, і, як-бы нічога не бывала, ён працягнуў:

— А, гэта вы! Ну, садзецеся і пералічайце вашыя памылкі.

У мяне зуб на зуб не пападаў, я ня мог гаварыць, але, сабраўшыся зь сiламі, сказаў, што ніякіх памылак у мяне не было і законаў савецкіх я не парушаў. Доўга ён мне пагражаў, аднак, бачачы маю рашучасьць, загадаў адвесьці назад у камэру.

Чэкісты доўгі час ціснулі на тое, што мы парушылі «мудрае вучэньне вялікага Сталіна»: будаваць культуру нацыянальную па форме і сацыялістычную па зьмесьце. Калі-ж мы прасілі сьледчых паказаць на прыкладах, дзе парушалася гэтая сталінская формула, дык аказвалася, што ні адзін зь іх нават і не ўяўляў сабе, што такое культура нацыянальная па форме і сацыялістычная па зьмесьце. Ужо сёньня камуністы не гавораць аб пралетарскай мове, а тады, калі мы сядзелі, нашых моваведаў абвінавачвалі за тое, што яны ў сваіх працах ігнаравалі пралетарскую мову.

У часе допытаў мне часта закідалі, што я вучням падаваў матар'ял аднабакова — найбольш націскаючы на беларускі аспэкт. На гэта я адказваў, што стараўся заўсёды гаварыць па-беларуску — законам гэта не забаранялася, — а матар'ял заўсёды падаваў на прыстойным узроўні...

Неўзабаве пасьля мяне ізноў узялі на допыт Азбукіна, але гэтым разам чэкісты ўжо падрыхтаваліся. Трэба сказаць, што Азбукін быў заядлы курэц, і чэкісты гэта ўлічылі. За тыдзень да допыту ў яго адабралі табаку, а бяз курыва ён зрабіўся проста вар'ятам. На допыце яго трымалі на нагах цэлы дзень. На яго вачах чэкісты курылі, але яму не давалі ні сесьці, ні закурыць. Нарэшце ён ня вытрымаў і згадзіўся паказваць на сябе і на іншых. Яго накармілі, далі закурыць, ды і з сабой далі яшчэ штук пяць папяросаў. Вярнуўшыся ў камэру, Азбукін сказаў, што становіцца на шлях пакаяньня. Потым высыпаў з кішэні на стол табаку і кажа, што гэта яму аванс за тое, каб ублытаў Смолі-

ча як шкодніка. Уся камэра страшэнна абурылася.

Прайшоў дзень, Азбукін, як кажуць, прыйшоў да сябе, супакоіўся крыху і перад усёй камэрай заявіў, што ня будзе пісаць ні на сябе, ні на іншых — няхай страляюць. Сваё слова ён стрымаў. Праз тыдзень Азбукіна ізноў паклікалі на допыт, але ён нічога не напісаў, а паперу, што далі для пісаньня паказаньняў, усю скурылі. За тое, што ён не датрымаў дадзенага слова, чэкісты страшэнна зьдзекаваліся зь яго: піхалі, зьневажалі апошнімі словамі, плявалі ў твар, толькі Азбукін застаўся цьвёрдым і ні на якія кампрамісы не пайшоў.

Пасьля А. Цьвікевіча і А. Смоліча найбольш адпаведным кандыдатам для публічнага працэсу быў-бы Я. Лёсік. Пры царскім урадзе Лёсік гадоў пяць хадзіў у кандалох, чалавек ён быў цьвёрды, вясёлы і заўсёды гатовы змагацца. Лёсік быў сялянскага паходжаньня. Здабыўшы пэдагагічную адукацыю, ён паехаў працаваць настаўнікам у Чарнігаўшчыну і падбухторваў там сялянаў на паўстаньне супроць памешчыка. Яго арыштавалі, з-пад арышту яму ўдалося ўцячы ў Нясьвіж. Тут нельга было доўга хавацца, бо яго ўсе ведалі. Нясьвіскія настаўнікі сабралі грошы і адправілі яго ў Пецярбург. Там ён нейкі час хаваўся ў прафэсара Вацлава Іваноўскага, які быў выкладчыкам хіміі ў Політэхнічным Інстытуце. Потым яму дапамагла беларуская суполка «Загляне сонца і ў наша ваконца». Суполка забясьпечыла яго дакумэнтамі і грашыма ды паслала ў Менск да Алеся Гаруна на нелегальную працу. У Менску Лёсіка арыштавалі разам з Гаруном за беларускую дзейнасьць і абодвух выслалі на катаргу.

Да нас дайшлі зьвесткі, што Язэп Лёсік нібыта згадзіўся стаць на публічны працэс. Але для публічнага працэсу аднаго Лёсіка было мала. Патрэбна было яшчэ некалькіх знаных беларусаў.

Далейшы выбар прыйшоўся на акадэміка Сьцяпана Некрашэвіча. Гэта быў вельмі ведамы і аўтарытэтны беларус. У 1915 годзе ён арганізаваў зь беларускіх уцекачоў у Адэсе моцнае беларускае згуртаваньне. У часе рэвалюцыі Некрашэвіч браў актыўны ўдзел у арганізацыі беларускіх палкоў на Румынскім фронце. Ужо пры савецкай уладзе савецкі беларускі ўрад паслаў яго ў Кракаў, ён купіў там у польскага магната за пяцьдзесят тысячаў залатых рублёў вялікую бібліятэку, прысьвечаную Літоўскай Русі, і прывёз гэтую бібліятэку ў Менск.

У Сьцяпана Некрашэвіча было выдатнае нацыянальнае мінулае, і камуністы вельмі настойліва пачалі прыставаць, каб ён стаў на адкрыты працэс і адгуляў ролю правакатара. Некрашэвіч цьвёрда вырашыў ня браць на сябе гэтага «званьня». Ён сядзеў у нутраной турме, так званай «амэрыканцы». Аднойчы, калі яго выпусьцілі ў прыбіральню, ён кінуўся ўніз з другога паверху і паламаў ногі. Яго паклалі ў турэмную бальніцу і доўга лячылі.

Чуткі аб спробе самагубства Некрашэвіча прайшлі ва ўсе камэры, дайшлі яны і да Лёсіка. Ён таксама сядзеў у «амэрыканцы». Тады Лёсік напісаў запіску Некрашэвічу і перадаў яе праз арыштаванага кантрабандыста, які разносіў ежу па камэрах. У запісцы Лёсік напісаў: «Сьцяпан, згаджайся, а на судзе мы адмовімся ад гэтых паказаньняў і выкрыем іх подласьць», — ды падпісаўся: «Язэп». Запіска папала на стол сьледчага, якому быў ведамы зьмест і папярэдніх Лёсікавых запісак. Лёсіка паклікалі, каб ён даў тлумачэньне аб сваіх паводзінах, а ён пачаў абвінавачваць чэкістаў. Тады яны, добра назьдзекаваўшыся, пасадзілі яго ў агульную камэру на агульны паёк. Да гэтага-ж часу Лёсік сядзеў у асобнай камэры і атрымваў лепшую ежу.

Няўдачы не спынілі чэкістаў — яны працягвалі пошукі выкрывальніка. У аднэй з камэраў «амэрыканкі» сядзеў народны камісар земляробства Беларусі Зьміцер Прышчэпаў. Яго вінавацілі ў тым, што ён нарабіў кулацкіх хутароў, а гэта, паводле камуністычнай тэорыі, узмацніла капіталізм у сельскай гаспадарцы і пашкодзіла калектывізацыі сялянскіх гаспадарак. Справу Прышчэпава ўплялі ў адно з нацдэмамі. Прышчэпаў быў асобаю ведамай і ўплывовай, таму чэкісты зьбіраліся адвесьці яму на працэсе ролю правакатара. Але Прышчэпаў наважыў ухіліцца ад гэтай ролі. Для гэтага ён зрабіў з падштанікаў і ніжняе сарочкі вяроўку. Уночы зачапіў вяроўку за паравы радыятар, прымацаваны да столі, стаў на прымацаваную да сьцяны койку, усадзіў галаву ў пятлю і адпіхнуўся. Вяроўка парвалася і ён грымнуўся на падлогу. Самазабойства не ўдалося. Яго паклікалі на допыт, але Прышчэпаў ня быў пакорлівы і гатовы на паслугі — ён абвінавачваў самую Кампартыю.

Камуністам стала ясна, што ні Лёсіка, ні Некрашэвіча, ні Прышчэпава нельга было ставіць на працэс. Калі гэта высьветлілася, чэкісты страцілі надзею знайсьці адпаведных асобаў сярод старэйшых, больш аўтарытэтных нацдэмаў-арыштантаў. Яны змаглі-б знайсьці правакатараў сярод менш ведамых беларусаў. Толькі гэта не зрабіла-б патрэбнага ўражаньня на грамадзтва. Выглядала так, што працэс стварыць нельга, а Масква вымагала такога працэсу. Адпаведнага чалавека пачалі шукаць сярод беларусаў, што засталіся на волі.

Гэтым разам чэкісты ўзяліся за Янку Купалу. Паэта забралі з дому і павезьлі ў ГПУ, каб там угаварыць, уламаць яго стаць на працэс. Па дарозе Купала паспрабаваў учыніць самагубства, і такім парадкам яго прыйшлося пакласьці ў шпіталь. Пасьля ўсіх гэтых няўдач камуністы сабралі нараду і начальнік сакрэтнага аддзелу Аргаў прапанаваў прыцягнуць да гэтае справы прэзыдэнта БАН праф. Ігнатоўскага. Запыталі Маскву і атрымалі згоду ад маскоўскага ГПУ. Тады ўжо прыступілі да арганізацыі працэсу разам зь мясцовымі камуністамі.

Мінулае Ігнатоўскага было далёка не на карысьць яму як камуністу: камуністам ён стаў толькі ў 1919 годзе.

Будучы яшчэ студэнтам, малады Ігнатоўскі выступаў з дакладамі на студэнцкіх сходах аб тым, што Беларусь ня ёсьць часткаю Расеі, гэта зусім апрычоны край, які мае сваю ўласную гісторыю і павінен мець сваё самакіраўніцтва. За такія даклады царскі ўрад у 1908 годзе выслаў яго ў Аланецкую губэрню на тры гады. Адбыўшы ссылку, Ігнатоўскі далучыўся да нелегальнай партыі беларускіх эсэраў. Ён пачаў працаваць выкладчыкам гісторыі ў розных гімназіях і адначасова распрацоўваў курс беларускай гісторыі для сярэдніх школаў.

Пасьля Лютаўскай рэвалюцыі Ігнатоўскі зарганізаваў у Менску настаўніцкі інстытут і быў першым дырэктарам гэтага інстытуту. У гэты час ён далучыўся да менскай падпольнай камуністычнай арганізацыі. У 1920 годзе Менск вызвалілі ад палякоў і Ігнатоўскі стаў наркомам асьветы. На гэтай пасадзе ён многа зрабіў для таго, каб перавесьці выкладаньне ў сярэдніх школах на беларускую мову.

У палітычнай дзейнасьці Ігнатоўскі заўсёды арыентаваўся на беларускія нацыянальныя партыі. У сваіх працах па гісторыі Беларусі Ігнатоўскі абвяргаў цьверджаньне расейскіх гісторыкаў, што беларусы нібыта зьяўляюцца

расейскай народнасьцю, ён даў выдатнае гістарычнае абгрунтаваньне беларускае дзяржаўнасьці.

Ігнатоўскага адразу не арыштавалі, а паклікалі на допыт да самога начальніка ГПУ Рапапорта. А той зьвярнуўся да Ігнатоўскага з такімі словамі:

— Раскажэце нам пра тайны мадрыдзкага двара.

Што адказаў яму Ігнатоўскі, не ўдалося даведацца. Толькі трымалі яго ў кабінэце Рапапорта доўга. Пры гэтым у часе допыту туды заходзілі сьледчыя з паперамі, трэба думаць, што яны прыносілі фальшывыя паказаньні, складзеныя самімі чэкістамі. Тут дарэчы будзе сказаць, што ў практыцы ГПУ ўжываўся такі мэтад: ад імя аднаго з арыштаваных пішуцца фальшывыя сьведчаньні на таго, каго хочуць арыштаваць, тады фальшыва абвінавачаны мусіць апраўдвацца. Як казалі сьведкі, ад Рапапорта Ігнатоўскі выйшаў вельмі ўсхваляваны, адзін пайшоў дадому і ў той самы вечар застрэліўся. Гэтым ён ухіліўся ад ролі абвінаваўцы і не дапусьціў стварэньня працэсу нацдэмаў.


Верагодна, менавіта самагубства Ігнатоўскага стала вырашальным у падрыхтоўцы працэсу над нацдэмамі — плян Масквы праваліўся. Пасьля гэтага нам дазволілі атрымваць харчовыя перадачы, пастрыглі, пагалілі першы раз за дзесяць месяцаў. А праз кароткі час нас усіх адправілі ў Маскву, у Бутырскую турму, а адтуль у высылку.

Гэта была першая стадыя пагрому нацыянал-дэмакратаў, за гэтай стадыяй неўзабаве наступіла другая, а потым і трэцяя. Першы раз сярод арыштаваных было многа маладых хлапцоў. Усё, чаго ад іх вымагалі, — выступіць у працэсе супроць старэйшага пакаленьня беларускіх дзеячоў. Ніхто гэтага не зрабіў. Адзін толькі Алесь Дудар напісаў досыць брудны верш супроць нацдэмаў, і яго выпусьцілі. Аднак крыху пазьней яго ізноў арыштавалі і адправілі ў высылку, адкуль ён ужо не вярнуўся.



Яўхім Кіпель. «Эпізоды». Нью Ёрк. Выдавецтва газэты «Беларус». 1998

ЗА ЧТО? ПОЧЕМУ? ЗАЧЕМ?



Сергей Граховский

По дороге в оцепление, работая на лесосеке, хлебая баланду в душной, как баня, за версту шибающей протухшими тресковыми головами столовой,— всюду, где бы ни был и что бы ни делал, пронзала током мысль, неотступно преследовали одни и те же вопросы: почему «черный ворон» сцапал именно меня, чей палец ткнул в мою сторону, кого обидел я, кому перешел дорогу? Любой год из двадцати трех прожитых был виден словно в зеркале. Ничегусеньки дурного ведь не натворил, и мухи-то не обидел. Тогда за что же такое жестокое наказание? Да и мне ли одному?

За восемнадцать месяцев тюрьмы и многие годы страданий в лагере мне встречались только честные, чистые и светлые душою, преданные нашему строю люди. Почему же им всем исковеркали жизнь? Кому это было нужно? По чьему приказу уничтожался цвет народа? Когда осенью 37-го года в Минск приехала страшная Военная коллегия Верховного суда во главе с вампиром Ульрихом, сколько только тогда светлых голов и чистых сердец было перестреляно молоденькими палачами в голубых фуражках!.. И лишь теперь, в наши дни, случайно обнаружили небольшую часть из тех черепов, пробитых в упор навылет,— в сосновом бору под названием Куропаты. В один день, 29 октября 1937 года, убили Платона Головача, Василя Коваля, Анатоля Вольного, Изи Харика. За что? Никто не ответит. Кто стрелял? Будто никто и не знает. А ведь где-то в «делах» есть их подписи под актами о приведении приговора в исполнение, где-то и по сей день еще живут натренированные в стрельбе по живым мишеням «ворошиловские стрелки». Не все они пошли вслед за своими жертвами, не все уже прожили свои окаянные жизни, многие ходят рядом с нами, получают персональные пенсии, прикреплены к неведомым народу распределителям — и балычок не пахнет человечиной — и, наверное, спокойно спят. А совесть? Не мучила и не мучит. Чего не было, того и нет. За многие годы духовного опустошения эта моральная категория утрачена навсегда служанками и прислужниками кровавого режима, готовыми выполнить любой бессмысленный и преступный приказ. Они как манкурты — если велено, и родную мать пристрелят.

Минуло более полувека, а память вновь и вновь возвращает в тот дождливый октябрьский вечер 1936 года. Я работал в радиокомитете. Рано подготовил и сдал тексты передач, но домой идти не хотелось: слонялся по редакции, листал подшивки газет, отчего-то было боязно выйти на бесприютную слякотную улицу. Потолкался в гастрономе, постоял в очередях, доехал трамваем до Комаровки и поплелся по темной и грязной Цнянской улице к барачного типа дому, где и мне выделили комнатку. Издали увидел освещенное свое окно, и обуяло тревожное предчувствие, навалился неведомый страх. Предчувствие не обмануло: беда поджидала меня, в тот вечер, 19 октября, она провела траурную черту в моей жизни.

Вошел в комнату и опешил: заплаканная жена сидела на кровати, а за столом двое военных с летными петлицами и лейтенантскими кубарями листали книги, снятые с этажерки. Чтоб меньше бросаться в глаза, оперативники нередко являлись в общевойсковой, а то и в гражданской одежде. Странно, но страхи отступили, я даже успокоился — я знал, что никакой вины за мною нет. Единственное, чему можно было бы придраться, так это к тому, что, вернувшись из командировки в пограничный район, я не успел своевременно сдать в комендатуру визу, но это ж мелочь. Она, наверное, и послужила причиной столь нежданного визита. Я полюбопытствовал, по какому праву они роются в моих книгах,— мне протянули ордер на обыск и на арест.

Однако и это меня не сразило. Подумал, попугают, побранят и к утру оставят в покое. Оперативники продолжали свое занятие: внимательно всматривались в каждую страницу. Книги, в которых находили пометки, подчеркивания, откладывали в сторону, складывали в папку мои исчерканные черновики, письма и фотоснимки. Глядел я на их работу, глядел, покуда не сморил сон. Я прилег и уснул.

В пять утра загудела под окном машина, раздались топот и незнакомые голоса людей, ворвавшихся в мою комнатку в коммунальной квартире радиокомитетского дома. Я отыскал его после войны. Он еще долго стоял средь новых многоэтажек. Я ходил вокруг него, смотрел на прежнее мое окно, видел в нем какие-то силуэты, но зайти не отважился, боялся, что расплачусь. На том пороге оборвалась моя молодость, навсегда потеряна любовь, там увидело свет мое дитя, только ж я его никогда не видел, скоро и оно стало жертвой кровавого террора: жену с ребенком на руках выбросили из ведомственной квартиры, исключили из института. Без денег, до самых морозов они ночевали в сквере на площади Свободы, родные и знакомые боялись дать им приют, помочь хоть чем-то. Когда жена похоронила сына, то подалась на дальний торфозавод, и наши пути разошлись навсегда.

Пять вооруженных человек увозили меня в ту промозглую октябрьскую рань в неизвестность. Рядом сидел мой будущий следователь, высокий, с серым лицом и темными кругами под глазами старший сержант Довголенко, с другой стороны жался маленький, в кожаном пальто, с овечьим профилем начальник секретно-политического отдела Шлифенсон, в затылок гнилью зубов дышал высоченный милиционер, впереди сидели на стопках изъятых у меня книг оба «летчика». Даже Чехов и Горький попали в крамольную литературу.

По дороге меня уже по-настоящему охватила тревога: если их столько собралось, дело, получается, не в визе. Ломаю голову, что же такое я мог натворить, но ничего не могу припомнить. И ощущение беды сжимает сердце, стучит в висках.

Привезли к тому самому подъезду, в который я не однажды входил за визой, повели в подземелье. В пустой огромной комнате многоопытный тюремщик мгновенно посрезал все металлические пуговицы и крючки, вытянул из ботинок шнурки, раздел, как в бане, приказал нагнуться и осмотрел то, что не всякий врач осматривает. А в дверях ожидал «выводной». Но как идти, когда все сваливается, а руки надо держать за спиной? Оторвал оторочку носового платка, кое-как подвязал в поясе брюки, и повели меня длинными продымленными «Беломором» коридорами на пятый этаж в небольшую комнату. В окне увидел холодное рассветное небо в темно-синих тучах с багровыми потеками от спрятанного где-то солнца. Слева за столом что-то писал Довголенко. На нем была серо-зеленая габардиновая гимнастерка, на левом рукаве выше локтя чекистская эмблема—вышитые в овале щит и меч, над манжетами — три пунцовые нашивки, похожие на сердца. Следователь указал мне на канцелярский стул, прикрученный в углу к полу. Окно выходило на Республиканскую улицу. По ней шел трамвай, в него садились люди, на обувную фабрику торопились рабочие, бежали дети в школу. Еще вчера вот так же ходил и я, но с этой ночи прежний мир стал для меня чужим и недосягаемым, все дорогое и желанное осталось за непреодолимой стеною, имя которой— неволя. Следователь молчит, что-то пишет, лишь время от времени зыркает в мою сторону. Яркая настольная лампа слепит мне глаза. Я откинулся на спинку стула и по привычке положил ногу на ногу. «Сядьте как положено: спиною не опираться, ноги поставить ровно, руки на колени. И так всегда». Тогда я еще не догадывался, что в этой утомительной позе мне придется сидеть и по трое суток кряду, пока не потеряю сознание и не сползу на пол, а молодые откормленные следователи тем временем, попивая чай с бутербродами, будут сменять друг друга, как заводные: «Признавайся в контрреволюционной троцкистской деятельности». И когда в коридоре вдруг заскрипят сапоги, следователь будет вскакивать, грохать кулаком по столу, кричать и сыпать отборными матюгами. Стихнут шаги — стихнет и следователь, примется копаться в бумажках, звонить домой, перешучиваться с женой и дочушкою и на вопрос, наверное, когда придёт, отвечать: «Да тут один тип у меня никак не хочет разоружаться, но никуда не денется».

На третьи сутки меня бросили в одиночку в так называемой «американке». Уже само по себе это здание способно подавить волю, деморализовать любого человека. Во дворе следственного корпуса стоит круглая, как водокачка, из серого бетона, с маленькими зарешеченными окошками внутренняя тюрьма. Подводя к ней, выводной, «вертухай», он же «попка», как зовут его арестанты, трижды свистит. А для чего, я не сразу понял. Один вертухай не умел свистеть. Из толстых, как сосиски, губ вырывалось какое-то шипение. Подвел он меня к дверям и приказывает: «Свистни».— «А я не умею»,— отвечаю. «Свистни, мать-перемать!» Стоим. Думаю, хоть подышу свежим воздухом, а вертухай из шкуры вон лезет — надо ж вести другого арестанта, а он со мною возится. Свистом они предупреждали надзирателей, чтоб, упаси Боже, не встретились, не увидели друг друга невольники.

Мой первый выводной был хороший свистун и, услышав ответный свист, ввел меня в это круглое сооружение, похожее на цирк, довольно-таки светлое. На первом этаже — четыре серых железных двери, с «кормушками» и «волчками». Пахнет свежей масляной краской, настоящей, на олифе. Этот запах запомнился навсегда — едва почувствую, как вспоминается «американка». Над головою секторами разбегается металлическое переплетение, на него наброшена веревочная сетка, посередине, на круглом мостке стоит надзиратель. Десять ступенек вверх, и я оказываюсь на красной ковровой дорожке, постеленной по кругу, над головою стеклянный купол. В стенах восемнадцать дверей. По дорожке, кругами, ходит второй надзиратель, заглядывает в волчки в каждую камеру, порою бухает в дверь, предупреждает кого-то невидимого: «Не спать!» — и идет дальше. Передо мною сама открывается дверь, и эта неожиданность поражает (а это надзиратель повернул на пульте ключ). Вошел, и дверь мягко щелкнула, как дверь западни. Камера, усеченный сектор круга, напоминает гроб. Под потолком — зарешеченное оконце из непрозрачного толстого стекла. Железный топчан с матрацем прикреплен намертво к стене, в углу вмурованы столик и скамеечка, возле двери — тумбоч-

ка и параша. Вот и вся обстановка. На тумбочке — три пайки хлеба и шесть кусочков, сахара за те дни, что пробыл у следователей.

Единственное желание — завалиться и заснуть. Только ткнулся к постели, открылась кормушка, просунулось прыщавое лицо «ходока по кругу»: «До отбоя ложиться запрещается, спать сидя тоже нельзя. За нарушение — карцер. Понятно?» — «Нормальному человеку понять это невозможно».— «Ничего, посидишь, поймешь». Кормушка бесшумно закрылась, и я действительно и понял, и ощутил весь ужас своего положения.

Ни баланда, ни хлеб в рот не лезли. Я ходил по камере, пять шагов от стены до двери и обратно, а в голове вертелись, сверлили мозг одни и те же мысли: «За что? Почему? Ради чего? Кому это нужно,—выставлять меня врагом народа?» Пока еще верилось, что разберутся, убедятся в моей невиновности и отпустят домой, где молоденькая жена ожидает со дня на день ребенка. Как она? Что с нею? Кто ей поможет? Ведь наши люди воспитаны в извечной бдительности, в страхе, даже близкие отворачиваются от семьи осужденного. К счастью, я ошибался. Когда дети отрекались от отцов, жены —от мужей, мой двоюродный брат, известный хирург Николай Иванович Бобрик, не только не отвернулся от моей несчастной жены, он не побоялся звонить моему следователю, выстаивать с передачами очереди перед тюрьмой, он не оставлял меня до последнего дня моей неволи.

Тяжкие мысли не покидали, в глазах мельтешили разноцветные зайчики, в голове гудела и звенела кузница. Я садился на скамейку, подпирал рукою щеку — и сами по себе закрывались глаза, и тотчас стук в дверь возвращал в действительность: «Не спать!».

Дождался наконец отбоя, провалился в сон. Спустя какой-то час — стук ключом по железной двери, голос из распахнутой кормушки: «Быстро на допрос. Давай, давай! Пошевеливайся!» Подхватился, никак не соображу, где я, что со мною, а когда дошло — бросило в дрожь и застучали зубы, руки трясутся и не попадают в рукава, хорошо хоть, что не надо зашнуровывать ботинки и застегивать пуговицы: все обрезано, все нараспашку.

Руки назад, свист — и повели через узкий двор, а во дворе, как в трубе, скулит пронзительный влажный ветер. В тупике навалена груда бумаг, папок, конвертов с письмами и фотографиями.

Их бросает в специальную печь невысокий военный, а второй орудует длинной кочергой, разбивает комья пепла. Сколько там сгорело рукописей, документов, диссертаций, снимков, дневников—и писем! Целый год, пока был под следствием, та зловещая печь не гасла. А сколько ее топили до меня и после?!

На каждом повороте длинных коридоров со множеством дверей мой выводной свистит или звенит ключами и наконец снова приводит в узкую комнату Довголенки. Пока шел, наслушался приглушенных криков, топота, стенаний и плача, доносившихся из кабинетов следователей. Самая «работа» — с полуночи и до рассвета. Днем «конвейеры» проходили тише, днем человека выматывали бессонницей и угрозами уничтожить родственников, расстрелять на глазах жену. «Так ведь она ж беременна!» — «Ну и что? Кому нужны байструки врагов народа?» Логика следователей железная.

Уже в который раз следователь заполняет мою анкету, задает одни и те же вопросы — путает, старается поймать на противоречиях. Упрямо пишет: «Место рождения—Польша». Как ни доказываю, что местность, где я родился и прожил десять месяцев до империалистической войны, никогда польской не была, ее временно захватывало правительство Пилсудского, — переубедить не могу. Да он и не хочет, ему так надо. Гремят матюги и кулак по столу: «Не учи меня! Лучше сознавайся в контрреволюционной троцкистской деятельности! Разоруженный враг нам не страшен. Запомни, что сказал Горький: если враг не сдается, его уничтожают! Уничтожим и тебя. Шлепнем — вот тебе и следствие, и суд».— «Без суда никто не имеет права карать»,— упираюсь я. «Эх ты, наивный желторотый щенок. Пристрелим и составим акт, что убит при попытке к бегству, тогда и доказывай, что невиновен». Думаю — логично, здесь может быть все; Если я троцкист, то почему не могу стать покойником? Мне называют членов моей организации, а я отродясь не слыхал фамилий — Барсуков, Левашов, Шляхтич. И мне кричат: «Врешь! Признавайся!» Помалу начинаю понимать, что тут правду считают ложью, а ложь — правдою. И работает безостановочный конвейер по трое суток, без сна, без еды и воды, а следователям приносят чай с лимоном, бутерброды с колбасой, апельсины, шоколад и пачки «Беломора». У меня пухнут уши от желания закурить, и я жадно втягиваю дым, выдохнутый следователем.

После допроса снова камера, снова: «Не спать!» И так день за днем. Горелой спичкой делаю черточки в нише окна. Ого, уже тридцать три, а я собирался утром того же дня быть дома...

Первая ночь без допроса обрадовала и удивила -проспал до подъема на одном боку. И днем не потревожили. Ни книг, ни газет — думай о своих «преступлениях», готовь признания. А в чём признаваться, не знает даже следователь — кроме ничего не значащих фамилий, ничего мне не предъявил. Меряю шагами камеру, наматываю километры, хорошо хоть, ходить не запрещают. А мысли замыкаются на Тане, как она там, что с нею? В эти дни она должна стать матерью. Как ни упрашивал следователя узнать о ее судьбе, ответ один: «Признаешься — дам свидание. Что ты за отец, если не хочешь даже узнать, кто у тебя родился! Не признаешься - посадим и ее, ребенка сдадим и приют и поменяем фамилию, чтоб никогда не нашли». Я впервые встретился с подобной бесчеловечностью. Еще недавно чуть ли не каждый день проходил мимо этого здания. Неприятный холод закрадывался в душу, но я и представить не мог, какая жестокость и какое звериное беззаконие властвуют за его стенами.

Молился: только бы не сойти с ума.

И вот однажды подкинули мне в камеру человека, уже стоявшего на грани сумасшествия. И кого? Того самого Сергея Шляхтича, о котором у меня так настойчиво допытывался следователь. Едва ввели его, глазок в двери уже больше не закрывался: хотели знать, действительно ли мы незнакомы. Мой несчастный сосед в минуты просветления рассказывал, что учился в вечернем пединституте вместе с Клименком и как-то увидел у него тот злосчастный дискуссионный сборник со статьей Троцкого — вот и все, больше ничего и никого он

не знал. День и ночь Шляхтич ходил по камере, что-то бормотал, глаза горели малиновым огнем. Он будил меня, плакал и говорил, что одинокая мать только и надеялась на него, а теперь изойдёт слезами и отдаст Богу душу. Как мог, я утешал его и сам глотал слезы. Молодой белокурый красавец бредил наяву, бился головою в стену, кричал: «Мамочка, я ж не виноват ни в чем! Мамочка, прости! Федя, что ты натворил!..» Видимо, убедившись, что мы не были знакомы, моего больного тёзку вскоре забрали из камеры и обо мне на целую неделю словно бы забыли. Даже подумалось, что убедились в моей невиновности. Ан нет, не уверились и не забыли. Вызвали поздней ночью. Довголенко разглядывал какие-то документы в выдвинутом ящике стола, перелистывал, крутил головою, усмехался, будто бы меня тут и не было. На шкафу я увидел перевязанные стопки книг и журналов: значит, привезли кого-то новенького. Довгаленко показал мне раскрытый членский билет Союза писателей: «Узнаете?» От неожиданности я едва выдавил: «Неужели и Тишка Гартный?..» — «Тут он, тут ваш вождь. Ну, может, теперь будем говорить правду? Мы думали, что взяли троцкиста, а выходит, никакой вы не троцкист...» — «Я ж вам говорил...» — Спокойно, молодой человек, запомни — двери у нас открываются только в одну сторону. Есть человек, будет и дело... Ведь вы, как оказалось, белорусский националист. А этот ваш идейный руководитель,— он потряс писательским, билетом Гартного,— на таких желторотых и рассчитывал. Теперь давайте рассказывать о своей контрреволюционной националистической деятельности. Честно признаетесь — поможете следствию, два-три года проверим в трудовой обстановке — и вернетесь к прежней работе... Не разоружишься — раздавим и размажем по стене, и следа не останется».

Так переиначили мои «преступные деяния».. Следствие тянулось целый год. Меня переводили из «американки» в тюрьму, из тюрьмы — обратно в одиночку, менялись следователи, но песня оставалась старой. Я узнал, что где-то тут рядом томятся мои институтские товарищи, мне зачитывали какую-то невероятную чушь: встреча нескольких друзей за бутылкой вина преподносилась как контрреволюционное сборище и заговор. Особенно напирали на связь с академиком Замотиным. Его дочь Таня, студентка-филолог, пригласила ребят из нашей группы к себе домой. Мы бывали у любимого профессора на консультациях, но вот в гости попали впервые. Это было так здорово и неожиданно...

В просторной, с высоким потолком столовой был накрыт стол. На белой скатерти переливались перламутром тарелки, тарелочки. Возле них блестели приборы — ножи и вилки, стояли розетки, соусницы. Все это мы видели впервые в жизни и растерялись, не зная, что к чему и как за что браться. Молча жались по углам. Обаятельный, веселый и остроумный хозяин как-то быстро и незаметно снял напряжение, и за столом мы не чувствовали себя скованно. А потом пели и даже танцевали.

Вместе с нами был один молчаливый парень, Танин однокурсник. Уж не он ли помог следствию узнать, что пили да ели и где кто сидел? Узнать и про то, чего и в помине не было и быть не могло. Мы ж были дисциплинированными, запрограммированными, законопаченными комсомольцами,— про якобы рассказанные со смаком политические анекдоты. Никто из арестованных не подтвердил навета, подсунутого следствием, но и это не спасло профессора, потому что одному из его учеников уж очень не терпелось заполучить должность своего учителя. В то время любое место освобождалось легко и просто — «сигналом» в органы. Просигналил и претендент на должность Замотина, и профессора продержали почти три года под следствием, и умер он исполняющим должность дневального лагерного барака. А в наших протоколах осталось «сборище» на его квартире.

За то время, что я находился под следствием, меня дважды водили на инсценированный расстрел. Будили далеко за полночь, одеться не давали, вели прямо в белье, но не в следственный корпус, а в глубокое темное подземелье, пропахшее тленом и карболкою, ставили лицом к бетонной стене, спрашивали «последний раз», подпишу я или нет протокол об участии в национал-фашистской организации, клацали затвором, били под дых и вели обратно в камеру «подумать». И теперь не понимаю, почему не спустили тогда курок.

Сергей Граховский. «Зона молчания». Москва, «Советский писатель». 1991

ОБЪЯВЛЕНИЕ

Если вас необоснованно уволили с работы, задержали выплату зарплаты, отказали в рассмотрении обращения, если нарушили ваше право, установленное Конституцией и законами – обращайтесь в общественную приемную Белорусского Хельсинкского Комитета.

Контактный телефон: 41522 (Игорь Кирин)

№ 27-28 (79-80)
Декабрь 2009 г.
Глуская ПАНОРАМА
Выходит с июля 1998 г.

Издатель - Игорь Кирин. Подписано к печати 30.12.2009.
Отпечатано на собственном оборудовании.
Тираж - 150 экз. Распространяется бесплатно.
Адрес для писем: 213879, г.п. Глуск, ул. Кирова, 43-18.
Тел. 41522. E-mail: glu-cl@mail.ru
http://www.gluskonline.net